НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК, ЯКІ АДКРЫЎ НОВУЮ ЭПОХУ СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ — ЭПОХУ ЎСЕАГУЛЬНАГА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА АБНАЎЛЕННЯ СВЕТУ, ПЕРАХОДУ АД КАПІТАЛІЗМУ ДА САЦЫЯЛІЗМА!

(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 51-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ).

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 30 (721) Пятніца, 1 лістапада 1968 г. Год выдання XXI Цана 2 кап.

У новым росквіце сіл сустракае наша краіна свята Вялікага Кастрычніка. Цудоўная перамога ў далейшым пакарэнні Космасу, масавыя рапарты аб датэрміновым выкананні планаў і абавязацельстваў бягучага года працаўнікамі сельскай гаспадаркі, поспехі прамысловасці і транспарту ў здзяйсненні праграмы пяцігодкі сведчаць аб тым, што савецкія людзі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі няспынна ідуць па ленінскаму шляху. У гэтым пераможным шэсці пачэснае месца займае і наш ардэнаносны універсітэт. Як заявіў днямі на ўрачыстым пленуме ЦК ЛКСМБ, мінскіх абкома і гаркома камсамола прафесар У. П. Платонаў, у гэтым годзе вучоныя універсітэта парадавалі Радзіму новымі дасягненнямі ў падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, у навуковых даследаваннях. Амаль кожны месяц на паліцах кніжных магазінаў паяўляюцца ўсё новыя і новыя манаграфіі, вучэбнікі нашых аўтараў. Вучоныя унеслі вялікі ўклад у вырашэнне працаўнікамі вытворчасці складаных тэхнічных задач. Але не толькі гэтым факультэты будуць рапартаваць юбілею Кастрычніка. Партыйныя арганізацыі, прафесары і выкладчыкі дасягнулі значных поспехаў у камуністычным выхаванні моладзі.

Сустракаючы 51-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі, калектыў універсітэта старанна рыхтуецца і да паўвекавога юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі. Гэтымі днямі кафедры і грамадскасць факультэтаў правяраюць ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў, намячаюць новыя рубяжы. Няма сумнення, што яны будуць паспяхова дасягнуты.

НАПЕРАД, КАМСАМОЛЬСКАЕ ПЛЕМЯ!

З гонарам за сваю слаўную моладзь святкуе савецкі народ 50-годдзе Ленінскага камсамола. Урачысты пленум ЦК ВЛКСМ, які адбыўся 25 кастрычніка ў Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, ператварыўся ў хвалюючую дэманстрацыю цеснага яднання ўсіх пакаленняў рэвалюцыі. Высокая ацэнка партыяй паўвекавога шляху камсамола, яго ўкладу ў будаўніцтва сацыялізма і камунізма, дадзеная ў прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева, у прывітанні ЦК КПСС камсамолу, натхняе ўсю савецкую моладзь на новыя подзвігі і здзяйсненні. Цяпер на сцягу камсамола будзе зззяць шосты ордэн — ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Ва Ўказе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР гаворыцца: «За выдатныя заслугі і вялікі ўклад камсамольцаў, савецкай моладзі ў станаўленне і ўмацаванне Савецкай улады, мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях з ворагамі нашай Радзімы, актыўны ўдзел у сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве, за плённую работу па выхаванню падрастаючых пакаленняў у духу адданасці запаветам У. І. Леніна і ў сувязі з 50-годдзем ВЛКСМ узнагародзіць Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі».

Універсітэцкая камсамолія з радасцю ўспрыняла і паведамленне аб узнагароджанні дзвюх беларускіх камсамольскіх арганізацый —Наваполацкай і Любанскай. Студэнты шлюць шчырыя прывітанні сваім сябрам і жадаюць ім новых поспехаў.

Рапартам перад партыяй, перад старэйшымі пакаленнямі стаў урачысты пленум ЦК ЛКСМБ, мінскіх абкома і гаркома камсамола, у якім прынялі актыўны ўдзел камсамольскія актывісты універсітэта. Прадстаўнікі нашага ардэнаноснага калектыву запэўнілі ЦК Кампартыі Беларусі і ЦК ЛКСМБ, што юнакі і дзяўчаты універсітэта і далей будуць высока несці гонар Ленінскага Саюза Моладзі. Яны лічаць праграму, выкладзеную ў прамове таварыша Л. І. Брэжнева і ў прывітанні ЦК КПСС, сваёй асабістай праграмай жыцця.

Воблік сучаснага пакалення—яго гераічныя справы. Наша моладзь можа сумленна глядзець у вочы сваім бацькам. Мільёны юнакоў і дзяўчат на заводах і будоўлях, у калгасах і навуковых лабараторыях сваёй самаадданай працай паўсядзённа памнажаюць моц нашай савецкай дзяржавы.

Цэнтральны Камітэт КПСС заклікаў камсамольцаў і моладзь да яшчэ больш актыўнага ўдзелу ва ўсенародным патрыятычным спаборніцтве за датэрміновае выкананне заданняў пяцігодкі, за дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Гэты заклік горача ўспрынят і камсамольцамі нашага універсітэта. Спраў многа, і ўсе яны цікавыя і разам з тым патрэбныя для Радзімы. Заўсёды быць наперадзе—пачэсны абавязак кожнага камсамольца, кожнага студэнта!

НОВАЯ ПЕРАМОГА Ў КОСМАСЕ

З 26 па 30 кастрычніка здзяйсняўся працяглы палёт новага савецкага касмічнага карабля «Саюз-3». Вёў касмічны карабель лётчык-касманаўт Герой Савецкага Саюза, заслужаны лётчык-выпрабавальнік СССР палкоўнік Берагавой Георгій Цімафеевіч.

За ўказаны прамежак часу зроблены эксперыменты пошуку, манеўравання і збліжэння штучных спадарожнікаў «Саюз-2» і «Саюз-3» з прымяненнем як аўтаматычных, так і ручных сродкаў пілатавання. Пасля паспяховага завяршэння гэтых эксперыментаў была здзейснена аперацыя мяккага прызямлення карабля «Саюз-2». Карабель «Саюз-3» працягваў далей свой палёт, неабходны для выканання ўсёй праграмы даследаванняў, і таксама ўдала прызямліўся ў намечаным раёне.

Навукова - тэхнічная інфармацыя, якая атрымана ў выніку выканання праграмы даследаванняў касмічнымі караблямі «Саюз-2» і «Саюз-3», мае выключнае значэнне для рашэння задачы зборкі вялікіх касмічных станцый з асобных вузлоў і блокаў. У сваю чаргу стварэнне ў космасе такіх базстанцый адкрые новую эру ў тэхніцы здзяйснення палётаў на Месяц і планеты сонечнай сістэмы.

Акрамя гэтага, наяўнасць такіх станцый адкрые небывалыя перспектывы для навуковых даследаванняў ва ўмовах, не дасягальных на зямлі нават на значных вышынях.

Шматлікі калектыў рабочых, тэхнікаў, інжынераў і вучоных, якія ўдзельнічалі ў стварэнні, запуску і прызямленні караблёў «Саюз-2» і «Саюз-3», прадэманстравалі да 51-й гадавіны Вялікага Кастрычніка новае дасягненне савецкай касмічнай тэхнікі.

І. НЕКРАШЭВІЧ,
прафесар.

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

У ГЭТЫЯ ПЕРАДСВЯТОЧНЫЯ ДНІ...

Каштоўнымі падарункамі сустракае 51-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка калектыў геолага-геаграфічнага факультэта. Тут завершана праца над кнігай «Беларуская ССР», якая выйдзе з друку ў канцы года ў выдавецтве «Прагрэс» на англійскай, французскай і іспанскай мовах. Гэта калектыўная праца кафедраў эканамічнай і фізічнай геаграфіі СССР.

Дэкан факультэта М. Т. Раманоўскі паведаміў і аб іншых навінах. Так, супрацоўнікі лабараторыі глебавай біягеахіміі падвялі вынікі сваёй пяцігадовай працы пад кіраўніцтвам акадэміка І. С. Лупіновіча ў манаграфіі «Мікраэлементы ў глебах БССР і эфектыўнасць мікраўгнаенняў». А калектыў кафедры агульнай геалогіі падрыхтаваў манаграфію «Карысныя выкапні Беларусі і іх выкарыстанне».

У перадсвяточныя дні госцем геолага-геаграфічнага факультэта будзе прафесар Сафійскага універсітэта І. Іваноў.

У гэты дні на хімічным факультэце знаходзіцца госць з Венгрыі доктар Е. Хаваш — супрацоўнік кафедры аналітычнай хіміі ва універсітэце ў горадзе Веспрэм, галоўны інжынер электрахімічнай лабараторыі фірмы «Радзелькіс». Гэтая фірма славіцца вытворчасцю мембранных электродаў, з дапамогай якіх хутка і дакладна вызначаецца колькаснае ўтрыманне іёнаў у растворах.

Доктар Е. Хаваш прачытае шэраг лекцый для супрацоўнікаў факультэта і правядзе некалькі лабараторных заняткаў.

Беларускія калегі паznаёмяць шаноўнага госця з выдатнымі месцамі сталіцы рэспублікі і гарадоў Салігорска і Брэста.

Дружба паміж студэнтамі юрыдычнага факультэта і працаўнікамі саўгаса «Гарадзішча» завязалася ў верасні, калі студэнты дапамагалі капаць бульбу.

А нядаўна партыйная арганізацыя саўгаса звярнулася на факультэт з просьбай падрыхтаваць для сельскіх працаўнікоў святочны канцэрт.

Зараз удзельнікі мастацкай самадзейнасці юрыдычнага факультэта рыхтуюцца да паездкі ў саўгас.

НАШ ДЭВІЗ—БАЯВЫ НЕСПАКОЙ

Напярэдадні 29 кастрычніка залу Тэатра оперы і балету запоўнілі тыя, каму сёння дваццаць і каму—семдзесят. У прэзідыум запрашаюць людзей, якія сваёй працай і энтузіязмам множылі слаўныя старонкі летапісу камсамола. Тут жа госці з ГДР, прэзідэнты зямляцтваў замежных студэнтаў, якія навучаюцца ва універсітэце, дэканы, сакратары камітэтаў камсамола факультэтаў.

Прысутныя сустракаюць іх шчырымі і бурнымі апладысментамі.

Пад гукі Дзяржаўнага гімна пачынаецца ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 50-годдзю Ленінскага камсамола.

Ад імя камсамоліі універсітэта з прывітальным словам выступіў сакратар камітэта камсамола Міхаіл Ціва.

Звычайныя словы, агульнавядомыя факты, але з якой урачыстасцю і цеплынёй яны аддаюцца ў сэрцы кожнага. Тысячы імён, тысячы розных лёсаў і падзей аб'ядналіся ў адно слова—камсамол.

...Кожнае пакаленне пакідае на зямлі свае прыкметы, свой след, на долю кожнага прыходзіліся свае цяжкасці. Але яны верылі і ведалі, што радасць, завяваная імі ў баях або ў працы, будзе радасцю для іх дзяцей, для будучых наследнікаў вялікай справы, пачатай у кастрычніку 1917 года. Таму з такой цеплынёй сустрэлі прысутныя выступленне камсамольца дваццатых гадоў прафесара М. Р. Ларчанкі.

— Дазвольце мне ад імя майго пакалення перадаць шчырае прывітанне ўсім камсамольскім пакаленням, пачынаючы з дваццатых гадоў да сённяшніх дзён, — гэтымі словамі Міхась Рыгоравіч Ларчанка пачаў сваю прамову. Ён расказаў, якімі падзеямі і марамі жылі яны, камсамольцы дваццатых гадоў. Адзначаючы вялікі трыумф савецкай навукі ў асваенні касмічнай прасторы, Міхась Рыгоравіч успомніў, як яны амаль паўвека назад марылі аб заваёве Сусвету, і ў пацвярджэнне гэтага ён прачытаў свае вершы тых гадоў.

...На вечары няцяжка было пазнаць былых воінаў па ордэнах і медалях, што ўпрыгожвалі іх грудзі. Гэта імі, камсамольцамі 40-х гадоў, напісана легендарная старонка гісторыі ВЛКСМ. Ад іх імя выступіў дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Давід Барысавіч Мельцэр. Ён перадаў прывітанне ад імя тых, хто ў суровыя дні Вялікай Айчыннай вайны па закліку партыі, са зброяй у руках абараняў Радзіму ад нашэсця фашыстаў.

450 студэнтаў нашага універсітэта адарваліся ад любімай справы і ўзялі ў рукі зброю. 450 пайшлі, а вярнуліся нямногія.

Іван Рыбакоў, сакратар камітэта камсамола, смелы і мужны разведчык загінуў пры выкананні баявога задання. Ніна Абрамава, студэнтка геафака, узначальвала падпольную арганізацыю ў Мінску—замучана ў Асвенцыме; і многія іншыя, памяць аб якіх камсамольцы 60-х ушанавалі мінутай маўчання.

Адзін за другім выступаюць камсамольцы, прадстаўнікі розных пакаленняў. Яны ўспамінаюць падзеі і справы свайго камсамольскага жыцця.

Ад імя Саюза свабоднай нямецкай моладзі выступілі госці з Іенскага універсітэта —сакратар акружкома Герхард Шроттар, намеснік сакратара Ганс Ауэрсвальд і Дзетлер Вехтэр. Яны перадалі ў адрас камітэта камсамола памятныя падарункі і ўручылі сакратару камітэта камсамола Міхаілу Ціве і прарэктару А. Я. Малышаву медалі «За ўмацаванне дружбы паміж Ленінскім камсамолам і Саюзам свабоднай нямецкай моладзі».

У гэты ўрачысты час павіншаваць са святам сваіх старэйшых сяброў прыйшлі піянеры.

Бурнымі апладысментамі адказалі прысутныя і на прывітальныя тэлеграмы.

Славай авеяны, партыя выхаваны Ленінскі камсамол адзначыў сваё пяцідзесяцігоддзе. І гэта свята стала яшчэ больш радасным ад таго, што ён удастоен новай высокай узнагароды — ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

Урачысты вечар, прысвечаны 50-годдзю ВЛКСМ, закончыўся вялікім святочным канцэртам.

А. ПАЎЛЯНКОЎ.

ПРЫЗВАННЕ

У шматтысячным калектыве студэнтаў нашага універсітэта ёсць нямала выдатнікаў. Нядаўна я пазнаёмілася з Таняй Баганік, студэнткай IV курса аддзялення рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта. За тры гады вучобы ў яе не было ніводнай чацвёркі. Праўда, зусім нядаўна адна ўсё ж яе падсцерагла. Але, я думаю, гэта часовая госця.

Яшчэ школьніцай Таня захаплялася літаратурай, і, відаць, нямала садзейнічалі гэтаму яе школьныя любімыя настаўнікі. І цяпер яшчэ Таня з вялікай цеплынёй успамінае пра іх. Ужо тады Таня жыва цікавілася ўсім, што ўзбагачала яе веды па літаратуры.

Калі пытаешся ў Тані, ці цяжка ёй, яна адказвае, што рыхтуецца да заняткаў не больш, чым іншыя. Проста, відаць, у яе больш сумленнасці, патрабавальнасці да сябе.

Таварыскі характар, уменне хутка знаходзіць агульную мову з людзьмі, арганізатарскія здольнасці заўважылі таварышы і выбралі яе камсоргам курса. На працягу двух год Таня кіруе камсамольскай арганізацыяй.

Любімы прадмет Тані—літаратура. Ёю яна захаплялася ў школе, ёю захапляецца і цяпер. І калі ў мінулым годзе ёй было прапанавана зрабіць даклад на горкаўскай канферэнцыі ў Іене (ГДР), яна з радасцю згадзілася і распрацавала цікавую тэму: «Горкі і МХАТ». Даклад быў адзначан на канферэнцыі.

З Іены Таня прыехала з запасам самых разнастайных уражанняў. Сустрэчы з нямецкімі студэнтамі, паездкі ў Берлін, Бухенвальд і многа іншых памятных сустрэч глыбока ўрэзаліся ў памяць. Таня часта расказвала таварышам, наколькі добра нямецкія студэнты ведаюць Горкага, як жыва цікавяцца яны падзеямі з жыцця пісьменніка, яго творамі.

Я спытала, як адносіцца Таня да сваёй будучай прафесіі.

— Школа з ранняга дзяцінства прыцягвала мяне,— гаворыць Таня.—Я люблю дзяцей, люблю працаваць з імі. Яшчэ ў школе нас рыхтавалі да работы піянерважатага.

Развітваючыся з Таняй, я міжволі падумала, колькі добрых спраў яшчэ на яе шляху. Пройдуць два гады, і новы настаўнік ўвойдзе ў клас. Многа сіл, душэўнай цеплыні і ведаў аддасць Таня сваім вучням. Яе будучая праца—гэта ж яе прызванне.

Л. МІРАНКОВА,
студэнтка-завочніца.

УНІВЕРСІТЭЦКІЯ ДЗЯЎЧАТЫ

Шлях да выдатнай адзнакі праходзіць праз напружаную працу. Гэта добра ведаюць студэнты-біёлагі, і таму яны многа працуюць пасля лекцыйных часоў.

НА ЗДЫМКУ (справа): студэнткі другога курса біяфака Л. ГРЫНЦЭВІЧ, З. ПІШЧЫК, А. ДЗЯМІДАВА, О. ДЗЕНІСЕНКА на практычных занятках па анатоміі чалавека.

А на здымку злева вы бачыце студэнтку трэцяга курса фізфака Л. СВІРСКУЮ, якая праводзіць доследы на занятках па радыёфізіцы.

Фота І. АСКІРКІ.

НАТАТКІ З СІМПОЗІУМА

НЕ ТОЛЬКІ ПРАВА, АЛЕ І АБАВЯЗАК

Як зрабіць ідэйна-выхаваўчую работу ў вну найбольш мэтанакіраванай і дзейснай, мабільнай і эфектыўнай, разнастайнай і цікавай — гэтыя і другія пытанні былі ўсебакова абмеркаваны Усесаюзным сімпозіумам, прысвечаным 50-годдзю камсамола і стагоддзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Гэты форум праходзіў у Бельцкім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя Алеку Русо Малдаўскай ССР. У рабоце сімпозіума прынялі удзел больш 400 вучоных, выкладчыкаў і камсамольскіх работнікаў амаль з усіх саюзных рэспублік. З Беларусі прысутнічала 10 выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў Мінска, Брэста, Віцебска, Магілёва, Беларускай сельгасакадэміі.

Першае пленарнае пасяджэнне адбылося ў гарадскім драматычным тэатры. Яго адкрыў рэктар Бельцкага педінстытута, старшыня аргкамітэта сімпозіума, кандыдат філасофскіх навук І. Г. Баршэвіч.

Прысутныя бурнымі апладысментамі горача віталі маці праслаўленага героя Краснадона Сяргея Цюленіна, якая знаходзілася ў прэзідыуме. Ёй паднеслі хлеб-соль і яркі букет кветак. Затым удзельнікаў форума віталі піянеры. Усё гэта пакінула глыбокія ўражанні.

З дакладам «Аб некаторых праблемах ідэйна-палітычнага выхавання студэнцкай моладзі» выступіў міністр народнай асветы Малдаўскай ССР, кандыдат гістарычных навук Е. С. Паставой. Ролі камсамольскіх арганізацый вну ў камуністычным выхаванні студэнцкай моладзі было прысвечана выступленне першага сакратара ЦК ЛКСМ Малдавіі П. К. Лучынскага. Ён зусім справядліва падкрэсліў, што вучоба не толькі права, але і абавязак. А таму неабходна павышэнне патрабавальнасці да студэнтаў ва ўсіх звяннях навучальнага працэсу, выкананне імі ўстаноўленых правіл і норм паводзін.

Начальнік управлення навучальных устаноў Міністэрства асветы СССР, кандыдат эканамічных навук В. К. Розаў гаварыў аб шляхах удасканалення навучання і выхавання студэнцкай моладзі ў педагагічных навучальных установах. На сацыяльных праблемах сучаснай моладзі сканцэнтраваў сваю ўвагу ленінградскі сацыёлаг О. В. Белых. Ён таксама адзначыў станоўчыя вынікі правядзення ў жыццё перспектыўнага пяцігадовага плана выхавання студэнтаў, распрацаванага ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце.

Даклады, прачытаныя на пленарным пасяджэнні, заключалі нямала цікавых думак, назіранняў і прапаноў.

Вечарам гарадскі драматычны тэатр таксама быў перапоўнен. На гэты раз пад яго зводамі гучалі напеўныя малдаўскія песні, іскрыстыя музыкальныя рытмы скрыпак і народных інструментаў, на сцэне адзін за другім мяняліся тэмпераментныя танцы. Гэта студэнты педагагічнага інстытута дэманстравалі перад гасцямі самадзейнае мастацтва. І яно было ацэнена вышэйшым балам — кожны нумар выклікаў бурныя апладысменты, і многія з іх выконваліся двойчы.

Калі над горадам Бельцы апусціўся позні вечар, пачалося факельнае шэсце камсамольцаў і моладзі да памятніка У. І. Леніну. Тут юнакі і дзяўчаты далі клятву вернасці бессмяротным ленінскім ідэям, роднай Камуністычнай партыі. Ва ўрачыстым маршы разам з моладдзю ішлі і ўдзельнікі сімпозіума.

На наступны дзень работа сімпозіума працягвалася ў аудыторыях педагагічнага інстытута. Даклады і паведамленні абмяркоўваліся ў васьмі секцыях: грамадскіх навук, педагогікі і псіхалогіі, прыродазнаўча-матэматычных навук і іншых. На секцыі грамадскіх навук цікавае паведамленне «Выхаванне камуністычнага погляду на лекцыях і семінарах па гістарычнаму матэрыялізму» зрабіла кандыдат філасофскіх навук, старшы выкладчык кафедры марксізма-ленінскай філасофіі нашага універсітэта Т. П. Багданава.

Формы і метады пазааудыторнага выхавання ажыўлена абмяркоўваліся на секцыях партыйнай і камсамольскай работы, ідэйна-палітычнага і інтэрнацыянальнага выхавання, маральна-эстэтычнага выхавання, культурна-масавай работы.

У секцыі культурна-масавай работы, у якой мы ўдзельнічалі, абмяркоўваліся цікавыя даклады і паведамленні.

Старшыня прафкома П. Папкоўскі пазнаёміў удзельнікаў з разнастайнай і плённай дзейнасцю студэнцкіх клубаў. У справядлівасці яго слоў мы пераканаліся пры наведванні інстытута. Напрыклад, інтэрнацыянальны клуб тут падтрымлівае сувязі з 64 краінамі свету. Сярод ганаровых яго членаў Д. Шастаковіч і М. Ларні, М. Ціханаў і Анна Зегерс, П. Броўка і Д. Секейрас і многія іншыя вядомыя савецкія і зарубежныя пісьменнікі, мастакі, кампазітары. Тут рэгулярна наладжваюцца сустрэчы, выстаўкі, вечары. Як мы пераканаліся, клуб адыгрывае вялікую ролю ў інтэрнацыянальным выхаванні студэнтаў.

Сімпозіум закончыўся цікавай і карыснай экскурсіяй у малдаўскія калгасы.

Ю. ГУСЕЎ,
кандыдат філасофскіх навук, удзельнік сімпозіума.

НОВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

ШЛЯХ ЦЯЖКІ І ГЕРАІЧНЫ

Кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў рэкамендавала да абароны доктарскую дысертацыю дацэнта А. М. Мацко. Тэма яго даследавання — «Дзейнасць Кампартыі Польшчы і Кампартыі Заходняй Беларусі па арганізацыі працоўных мас на барацьбу супраць прыгнёту буржуазіі і памешчыкаў (1918 — 1933 гг.)». На працягу многіх год аўтар збіраў у архівах Савецкага Саюза і Польскай Народнай Рэспублікі дакументальны матэрыял, праналізаваў вялікую колькасць справаздач і рашэнняў з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК Кампартый, мясцовых партыйных арганізацый, іх перапіску, перыядычныя выданні. Шырока выкарыстаны таксама і матэрыялы розных устаноў буржуазнай Польшчы.

Дысертацыя Аляксандра Мікалаевіча па сутнасці з'яўляецца першым буйным даследаваннем дзейнасці КПП і КПЗБ па кіраўніцтву рэвалюцыйнай барацьбой за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных. У ёй узняты і вырашаны многія пытанні, з марксісцка-ленінскіх пазіцый дана навуковая ацэнка многім падзеям і дыскусійным праблемам. Дарэчы, аўтар правёў вялікую работу па ўдакладненню фактаў, прозвішчаў актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнай барацьбы, расшыфроўцы псеўданімаў многіх членаў КПП і КПЗБ. Неабходнасць такіх удакладненняў дыктуецца не толькі інтарэсамі навукі, але і маральнымі матывамі. Справа ў тым, што па розных прычынах у дакументах не адлюстраваны сапраўдныя імёны многіх герояў падполля, да нашых дзён людзі не ведаюць усіх тых, хто ішоў у першых шарэнгах барацьбітоў, ахвяраваў сваё жыццё за свабоду народа. Цяпер ёсць магчымасць абнародаваць раней сакрэтныя дакументы, асабістыя пісьмы, назваць імёны камуністаў.

Але галоўнае ў даследаванні не ў гэтым. У чатырох главах дысертацыі падрабязна разглядаюцца ўмовы, у якіх ствараліся і дзейнічалі партыйныя арганізацыі ў Польшчы і Заходняй Беларусі, вялікае месца адводзіцца аналізу поспехаў, памылак і упушчэнняў у кіраўніцтве рэвалюцыйнай барацьбой рабочых і сялян. Аляксандр Мікалаевіч на вялікім фактычным матэрыяле даказаў, што пятнаццацігоддзе пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі было для працоўных Заходняй Беларусі і Польшчы неймаверна цяжкім і разам з тым гераічным. Рабочыя і сяляне ішлі за камуністамі таму, што бачылі ў іх выразнікаў сваіх карэнных інтарэсаў, людзей, якія не шкадуюць жыцця ў імя вызвалення працоўных ад капіталістычнай эксплуатацыі і нацыянальнага прыгнёту.

Каштоўна, што шмат увагі ў даследаванні ўдзяляецца барацьбе КПП і КПЗБ за аб'яднанне рабочага, сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху.

Рост аўтарытэту КПП і КПЗБ сярод працоўных перад другой сусветнай вайной дысертант справядліва разглядае як вынік іх адданасці марксізму-ленінізму, справе міру, дэмакратыі і сацыялізма.

З вялікай цікавасцю чытаюцца старонкі аб складанай і мужнай рабоце камуністаў пасля неабаснаванага роспуску КПП і яе састаўных частак — КПЗБ і КПЗУ. Нягледзячы на адсутнасць партыі, падкрэслівае аўтар, былыя члены КПП, КПЗБ і КПЗУ не спынялі сваёй барацьбы з эксплуататарамі, па абавязку сэрца выступілі ў абарону СССР, рыхтавалі народ да рашаючых бітваў супраць фашызму.

Трэба адзначыць, што, нягледзячы на мнагапланавасць, даследаванне А. М. Мацко вызначаецца лагічнасцю, стылістычнай стройнасцю. Усе вывады падрабязна абгрунтаваны, аўтар смела выказвае свае думкі па спрэчных пытаннях. У цэлым яго праца з'яўляецца вялікім укладам у гістарычную навуку нашай краіны, узбагачае яе шэрагам новых палажэнняў, раней невядомых фактаў.

Дысертацыя прысвечана мінуламу, але яна цесна звязана з сучаснасцю, многія яе старонкі дапамагаюць глыбей зразумець падзеі сённяшняга дня, стратэгію і тактыку сучаснага міжнароднага рабочага і камуністычнага руху. Знамянальна і тое, што праца закончана ў дні падрыхтоўкі беларускага народа да выдатных юбілеяў.

Даследаванне дацэнта Аляксандра Мікалаевіча Мацко — сведчанне неаслабнай увагі вучоных універсітэта да актуальных праблем гісторыі КПБ і беларускага народа.

А. ЦАРУК,
кандыдат гістарычных навук.

У ПАХОДЗЕ

Думку аб паходзе на Поўнач выношвалі даўно. Нарэшце быў атрыман дазвол ЦК камсамола Беларусі на падрыхтоўку гэтага мерапрыемства.

Нас было дзесяць, дзесяць мотатурыстаў, якія прайшлі практыку язды на дарогах Крыма, Карпат і Каўказа. У кожнага за плячыма былі дзесяткі тысяч кіламетраў пройдзенага шляху, але гэты паход патрабуе ад нас усёй практыкі і ведаў, набытых гадамі падарожжаў. Разумеючы ўсё гэта, група рыхтавала да паходу кожную «дробязь».

ЦК камсамола загадзя разаслаў пісьмы ў гаркомы і абкомы камсамола па нашаму маршруту.

Старт быў дадзен на стадыёне «Дынама». Далёка за горад праводзілі нас на матацыклах нашы таварышы-турысты, па чарзе абганяючы калону і даючы развітальныя сігналы. Пачуццё гонару і адказнасці адчуваў кожны з нас, ад'язджаючы ўсё далей і далей ад роднага Мінска. Наперадзе ў нас былі дзесяткі сустрэч з камсамольцамі і працоўнымі гарадоў і сёл. На шляху мы павінны былі чытаць лекцыі аб беларускім камсамоле ў гады вайны і на ўдарных мірных будоўлях, аб дасягненнях БССР за гады Савецкай улады, аб Кампартыі Беларусі, пад кіраўніцтвам якой рэспубліка дасягнула небывалага росквіту.

Моўчкі стаялі рабяты каля магілы вялікага паэта А. С. Пушкіна ў сяле Пушкінскія Горы.

Разам з супрацоўнікам гаркома камсамола г. Ленінграда група агледзела апошнія яваўчыя кватэры У. І. Леніна перад Кастрычніцкім узброеным паўстаннем, пабывала ў Разліве.

Далей пайшла Карэлія, рэспубліка прыгожых азёр і дрэнных дарог. Замест штодзённай нормы праезду 250 кіламетраў мы з цяжкасцю пераадольвалі па 60—70, а зверху ўжо каторыя суткі ліў дождж. Добра назіраць за ім, калі сядзіш у цёплым пакоі, але ў паходзе гэта непрыемнае адчуванне. Кроплі дажджу неспачувальна білі па твары, траплялі за варатнік і ў боты.

— Па такіх дарогах хутчэй пяшком зойдзеш, чым на калёсах заедзеш,—зауважыў інжынер А. Старцаў з Белсантэхмантажа № 2.

Да вечара група спынілася на беразе мнагаводнай ракі Вуоксе. А колькі рыбы там! Калі затрашчаў касцёр, стомленасці як і не бывала. Не паспелі мы разбіць лагер, як Марат Клышко, супрацоўнік Акадэміі навук БССР, ужо «нацягаў» рыбы проста з берагу: нездарма ж ён вёз вуды з Беларусі.

Петразаводскі абком камсамола сустрэў нас урачыста. Лілі Краўчанка, аспірантцы АН БССР, выпускніцы гістфака нашага універсітэта, а ў паходзе загадчыку лектарскай групы, было цяжка. Ёй прыйшлося выступаць перад супрацоўнікамі абкома камсамола, студэнтамі універсітэта і на будоўлі. Разам з ёй перад працоўнымі Петразаводска выступілі і іншыя лектары групы. Мне давялося расказаць аб развіцці турызму ў БССР мясцовым турыстам у іх клубе «Карэлія». Мінулы год рабяты з Петразаводскага універсітэта былі гасцямі ў нашым універсітэце. Яны памятаюць цёплы прыём у Мінску і прасілі мяне перадаць прывітанне камсамольцам Белдзяржуніверсітэта.

У Карэліі мы агледзелі Кіжы—гордасць рэспублікі, наведалі водапад Ківал, паспрабавалі ваду з Пятроўскай крыніцы.

На развітанне мы падарылі абкому камсамола барэльеф Брэсцкай крэпасці.

Далей падарожжа працягвалася па Беламорска-Балтыйскаму каналу і Беламу моры на буксіры. Вось ужо праўду гавораць, што турысты заўсёды ўладкуюцца. За чатыры дні плавання да горада Архангельска нашы дзяўчаты ўжо смела арудавалі на камбузе (кухні), а рабяты, як запраўскія матросы, спраўляліся са швабрай у час уборкі. Калі выйшлі ў мора, пачало штармiць. Камісар падарожжа, супрацоўнік АН БССР А. Шацілаў, выказаў думку: лепш дрэнныя дарогі Карэліі, чым штармавое мора. Сёй-той яго са згодай падтрымаў.

У Архангельскім абкоме сакратар сустрэў нас як старых знаёмых: «Паедзеце ў камсамольскі лагер, там якраз праходзіць семінар, і вас там ужо чакаюць»,— сказаў ён. І тут мы сапраўды адчулі, што ўяўляе сабой дарога-ляжнёўка. Па балоце праложаны бярвенні, змацаваныя паміж сабой скобамі. Уз'язджаеш на адзін канец такога прыстасавання — другі падымаецца, а за спіной пасажыр і 60—70 кілаграмаў груза. Не вытрымаўшы такога напружання, А. Старцаў рухнуў у балота разам з пасажырам і грузам. Забягаючы наперад, скажу, што такая трэніроўка дала яму магчымасць выйграць другое месца ў мотаэстафеце на X рэспубліканскім злёце ў горадзе Кіеве.

У камсамольскім лагеры нам прыйшлося расказаць усё, што мы ведаем аб Беларусі і яе людзях. Праз дзень мы былі ўжо ў Северадзвінску Архангельскай вобласці. Тут пасля сустрэч і выступленняў першы сакратар ГК ВЛКСМ паказаў нам горад і магілы экіпажа ледакола «Сядоў».

З Архангельска наш шлях працягваўся ў таварным вагоне, бо дарогі да Волагды пакуль няма.

Яраслаўль сустрэў нас сонечным надвор'ем. Першы раз за час паходу знялі свіцёры. Праз 60 кіламетраў агледзелі горад Растоў Вялікі, дзе ў Крамлі будуецца філіял міжнароднага лагера «Спутник». Вечарам адбылася гутарка з маладзёжнымі атрадамі будаўнікоў.

А праз два дні група прыбыла ў Гомель на рэспубліканскі злёт пераможцаў паходаў па дарогах бацькоўгерояў.

Удзельнікам паходу было аб чым расказаць злёту.

В. БЕЛАКОСАЎ.

НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) Г. КАБЛОВА, выпускніца матфака, кладзе кветкі на магілу загінуўшых; (унізе) паход завершан.

Фота М. ГРЫШЧУКА.

З НАВАСЕЛЛЕМ!

Новы студэнцкі інтэрнат па вуліцы Кастрычніцкай не падобны на іншыя. І не дзіўна. Такі гмах у Мінску пабудаван упершыню. Белы дзесяціпавярховы будынак нагадвае хутчэй утульную гасцініцу. Гэта ўражанне узмацняецца, калі ўваходзіш у вестыбюль. Яго незвычайная архітэктура, афарбоўка прыцягваюць увагу арыгінальнасцю і навізной.

Як і ва ўсякім вышынным будынку, ёсць, вядома, і ліфт.

А зараз заглянем у пакоі. Яны разлічаны на чацвярых. Першае, што кідаецца ў вочы,—гэта паркетная падлога. Яшчэ адна прыемная нечаканасць — невялікі халадзільнік, які знаходзіцца ў сцяне. Ці не праўда—непрывычна для студэнтаў?

Добра абсталяваны кухні. У іх па дзве газавыя пліты, ёсць халодная і гарачая вада, смеццепровад.

Новы інтэрнат нам спадабаўся. Прыемна было заглянуць у светлыя памяшканні, прайсціся па павярхах. Незвычайна, што на кожным з іх афарбоўка сцен розная: жоўтая, блакітная, ружовая.

Нашым праважаючым па інтэрнаце быў камендант Пётр Нікіфаравіч Алфяронак. Ён з задавальненнем расказаў нам аб сваёй «гаспадарцы».

— Тут ёсць усе ўмовы для таго, каб інтэрнат стаў узорна-паказальным. Але аднаго гэтага мала. Усё будзе залежаць ад студэнтаў, якія паселяцца ў ім. Сачыць за чысцінёй, беражліва адносіцца да ўсяго таго, што зроблена будаўнікамі,— першы абавязак кожнага. Я думаю, што нам у гэтым дапамогуць камсамольская арганізацыя і студэнцкі савет.

Паклапаціліся мы і аб тых, хто завітае да нашых студэнтаў у госці. У вестыбюлі паставім некалькі столікаў і крэслаў. Кожны зможа пачакаць тут сяброў, прагледзець свежыя газеты і часопісы.

Скора ў інтэрнаце стане людна, па-маладому шумна. Загрукаюць дзверы, пачуюцца вясёлыя галасы юнакоў і дзяўчат.

Пажадаем жа навасёлам шчасліваго, цікавага жыцця ў новым інтэрнаце.

Н. СІМУРАВА,
А. ЦЯПЛЮК,
студэнткі журфака.

Новы універсітэцкі інтэрнат. Фота І. АСКІРКІ.

УСЛЕД ЗА МАРАЙ

Ёсць на Палессі вёска Задуб'е. Мабыць, назва яе ад таго, што з усіх бакоў лес: дубы-тугадумы, стройныя сосны. Тут прайшло дзяцінства Ніны Валасюк, адсюль пачалася яе дарога ў жыццё.

Жвавую, сціплую дзяўчынку любілі ў школе. Ніна была старшынёй савета дружыны, зацейнікам многіх цікавых піянерскіх спраў. Ля самай хаты Ніны — бібліятэка, і дзяўчына многа чытала, захапілася вершамі і сама спрабавала пісаць. Адзін яе верш нават надрукавалі ў газеце... З той пары прайшло шмат часу. Ніна старанна вучылася, нязменна была ўдзельніцай дыспутаў і літаратурных вечароў. І заўсёды так: за што ні возьмецца — даб'ецца, арганізуе. Камсамольцы нездарма выбралі яе сваім важаком. А вось пра мару сваю дзяўчына нікому не расказвала. Толькі раз, ужо на выпускным вечары, прызналася сяброўцы, што марыць стаць журналісткай, хоча убачыць многа цікавага, пісаць пра добрых людзей.

Калі пачула Ніна, што па радыё аб'яўлен конкурс на лепшы нарыс, рэпартаж «Люблю мой край, старонку гэту», яна напісала аб сваёй вёсцы Задуб'е і аднакласніках. Яе матэрыялы «Дзень працоўнага шчасця» і «Камяністымі сцежкамі жыцця» аказаліся ў ліку лепшых. Як пераможцу конкурсу Ніну рэкамендавалі для паступлення ў БДУ.

Неспакойную, цікавую прафесію выбрала дзяўчына. Цяпер усё жыццё Ніна будзе ў пошуках.

— Ніна, табе пісьмо, скачы! — у пакой убегла сяброўка Клава Кашперка з Хойніцкага раёна. Дзяўчаты здавалі разам экзамены, пасябравалі і жывуць у адным пакоі інтэрната.

— Сяброўка піша, — усміхаецца Ніна. — Тая самая...

На стале — вазачка з лісткамі клёну і кветкамі.

Ніна глядзіць у акно. Прыгожы Мінск! А ёй ужо хочацца пабыць дома, на Палессі. Там, на ўзлессі, гараць гронкі рабін, каліны — ляснога вінограду, як цымбалы, звіняць сосны. І ўначы ёй будуць сніцца сінія бары, дубы і вёска Задуб'е на Ганцаўшчыне.

М. БАБОК,
студэнт II курса журфака.

НАШ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ КЛУБ

ПРЫВІТАННЕ З УКРАІНЫ

Ле Дык Зы — в'етнамскі студэнт, які сёлета закончыў падрыхтоўчы факультэт БДУ імя У. І. Леніна і зараз вучыцца па выбранай спецыяльнасці на першым курсе Харкаўскага політэхнічнага інстытута. Сёння мы друкуем яго пісьмо ў адрас выкладчыкаў падрыхтоўчага факультэта.

ПАВАЖАНЫЯ ВЫКЛАДЧЫКІ! Цяпер мы ўжо на Украіне, далёка ад вас. Мне вельмі шкада, што я не паспеў развітацца з вамі. За гэта вы прабачце, калі ласка. Я ніколі не забуду вас, не забываю Мінск, горад, у якім я жыў два гады. Аб Мінску і універсітэце ў мяне засталіся незабыўныя ўражанні.

За нядоўгі час вучобы ў Мінску я даведаўся, што беларускі народ — працавіты і міралюбівы. Беларусы заўсёды і ўсюды з вялікай павагай, гарачай любоўю адносяцца да нашага народа, да нашых в'етнамскіх студэнтаў. Дзякуючы ўсім вам, педагогам, урачам, я закончыў падрыхтоўчы факультэт, лепш стала маё здароўе. Я заўсёды памятаю, што гэтым павінен вашай увазе і клопатам.

Цяпер я раскажу вам аб маіх справах. Я і мае сябры, якія паступілі ў Харкаўскі політэхнічны інстытут, жывём у адным інтэрнаце. Але на факультэце аўтаматыкі і прыборабудавання толькі я адзін з в'етнамскіх студэнтаў. Перада мной стаіць многа цяжкасцей, але я абяцаю вам, што буду добра займацца, каб стаць добрым інжынерам. Справы ў мяне цяпер ідуць нядрэнна.

Як займаюцца вашы новыя студэнты? Можа, лепш, чым мы ў мінулым годзе? Я так і думаю.

Яшчэ раз жадаю вам поспехаў, здароўя, плённай работы. Жадаю ўсім вашым новым студэнтам выдатна засвоіць рускую мову, паспяхова закончыць навучальны год.

Ваш студэнт ЛЕ ДЫК ЗЫ.

АЎТОГРАФ ПІСЬМЕННІКА

Зала бібліятэкі Палаца прафсаюзаў перапоўнена. Тут сабраліся чытачы, каб абмеркаваць кнігу Івана Рыгоравіча Новікава «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску». На дыспуце прысутнічае аўтар, а таксама ўдзельнікі Мінскага падполля — героі кнігі. Дыспут адкрывае загадчыца бібліятэкі, якая шчыра вітае гасцей і дзякуе аўтару за праўдзівую аповесць.

А потым Іван Рыгоравіч расказаў аб сваіх карпатлівых пошуках матэрыялаў аб героях мінскага падполля, аб цікавых сустрэчах.

Сваімі думкамі, разважаннямі падзяліліся чытачы кандыдат медыцынскіх навук Галіна Міхайлаўна Кастрова, студэнтка пятага курса філалагічнага факультэта нашага універсітэта Ліда Валасевіч, маладая рабочая Тамара Лазарэнка, выкладчыца фізкультуры Надзежда Бокач і другія.

З захапленнем слухалі прысутныя выступленні героя кнігі, актыўных удзельнікаў мінскага падполля. Фама Фадзеевіч Фясько, Дзмітрый Сафронавіч Петухоў, Уладзімір Міхайлавіч Фёдараў, Аляксандр Лявонцьевіч Матусевіч расказалі аб сваёй падпольнай дзейнасці ў Мінску ў гады часовай акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яны горача падзякавалі Івану Рыгоравічу за цікавую кнігу, за праўдзівае раскрыццё вобразаў удзельнікаў Мінскага падполля.

У заключэнне чытачы пажадалі Івану Рыгоравічу творчых поспехаў.

На здымку: І. Р. Новікаў дае аўтограф.

Тэкст і фота І. АСКІРКІ.

«Лаўзітцэр Рундшау»: Незабыўныя дні Альфрэда

ПОЦІСК РУК ПРАЗ ТЫСЯЧУ КІЛАМЕТРАЎ

27 верасня нямецкая газета «Лаўзітцэр Рундшау» — орган Котбузскага абласнога камітэта Сацыялістычнай Адзінай партыі Германіі расказала сваім чытачам аб цікавай сустрэчы, якая адбылася ў горадзе Шпрэмберг/Лаўзітц. Да аднаго са старэйшых жыхароў горада Альфрэда Барке прыехаў у госці савецкі ваенна-служачы, выпускнік Беларускага дзяржаўнага універсітэта Віктар Іванавіч Колесаў. Колесаў пазнаёміўся з ветэранам рабочага руху Германіі два гады назад на вечары Таварыства савецка-германскай дружбы. На гэты раз ён прывёз Альфрэду Барке сардэчнае прывітанне з Беларусі і незвычайны падарунак — копію дыпломнай працы.

Справа ў тым, што Альфрэд Барке — актыўны ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі, адзін з першых чырвонагвардзейцаў з ліку немцаў. Дыпломная Колесава і была прысвечана развіццю форм інтэрнацыянальнай салідарнасці народаў Расіі і Германіі ў 1917—1922 гг. Студэнт-завочнік, праходзячы службу ў ГДР, сабраў багаты фактычны матэрыял, завязаў сувязі з многімі нямецкімі грамадзянамі — удзельнікамі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ў нашай краіне. Ён асабліва падружыўся з Альфрэдам Барке, успаміны і асабісты архіў якога дапамаглі асвятліць шэраг пытанняў з яшчэ слаба даследаванай і ў нашай краіне і ў ГДР старонкі сумеснай барацьбы працоўных Беларусі і нямецкіх салдат-інтэрнацыяналістаў за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі. У дыпломнай, якая была абаронена ва універсітэце ў маі гэтага года, падрабязна расказана аб незабыўных днях у жыцці Альфрэда Барке і яго землякоў.

Дарэчы, газета, якая зацікавілася сустрэчай маладога савецкага камуніста з членам Камуністычнай партыі Германіі—САПГ з 1922 года А. Барке, так і назвала свой артыкул: «Незабыўныя дні Альфрэда». Аўтар— сакратар Таварыства германа-савецкай дружбы горада Шпрэмберг/Лаўзітц Рыхард Ян падкрэслівае, што Альфрэд Барке, нягледзячы на ўзрост—яму ўжо 72 гады,—вельмі часта бывае ў гасцях у нямецкай моладзі—сярод школьнікаў, ваеннаслужачых Народнай Арміі, рабочых. Ён з удзячнасцю ўспамінае жыхароў Слуцка, Бабруйска, Несвіжа і іншых гарадоў і пасёлкаў, з якімі разам прыйшлося змагацца за ўстанаўленне і ўмацаванне Савецкай улады. Беларусь дапамагла яму, сыну беластоцкага ткача, выбраць празільны шлях жыцця ў час велічнага гістарычнага пералому — стаць барацьбітом за ідэалы Маркса—Энгельса—Леніна. Вось чаму для яго каштоўным падарункам была праца савецкага студэнта-воіна, вось чаму такім прыемным для яго было і прывітанне з Беларусі.

У Шпрэмберг/Лаўзітц Альфрэд Барке — адзіны жывы ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1967 годзе ён быў узнагароджан Савецкім урадам ордэнам Чырвонай Зоркі, яму ўручаны Ганаровая грамата ЦК Сацыялістычнай Адзінай партыі Германіі, залаты медаль Таварыства германа савецкай дружбы. Нядаўна яго імя занесена ў «Залатую кнігу», якая заведзена ў сувязі з 20-годдзем ГДР.

На развітанне Альфрэд Барке папрасіў В. І. Колесава перадаць выкладчыкам і студэнтам Беларускага універсітэта віншаванні ў сувязі з прыбліжаючымся святам Вялікага Кастрычніка і 50-годдзем БССР і Кампартыі Беларусі.

На здымках: фотакопія артыкула аб Альфрэдзе Барке ў газеце «Лаўзітцэр Рундшау»; Альфрэд Барке са сваёй жонкай разглядаюць нумар нашай універсітэцкай газеты; Альфрэд Барке з выпускніком філасофскага аддзялення БДУ В. І. Колесавым.

СПОРТ

ФІНАЛЬНЫЯ БАТАЛІІ

Пяць дзён ва універсітэцкай спартыўнай зале праходзіў фінал першынства вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі па валейболу. Права прыняць удзел у гэтых спаборніцтвах заваявалі жаночыя каманды політэхнічнага і інстытута фізкультуры, Мінскага і Гродзенскага педагагічных інстытутаў, Гомельскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту і валейбалісткі універсітэта.

Сярод мужчынскіх каманд выйшлі ў фінал валейбалісты сталічнага педінстытута, політэхнікі, спартсмены інстытута фізкультуры, Магілёўскага машынабудаўнічага і Мінскага інстытута народнай гаспадаркі.

Вельмі цікавай была сустрэча паміж нашымі валейбалісткамі і камандай Мінскага педагагічнага інстытута. Ад выніку гэтага паядынку залежала—быць нашым дзяўчатам на другім ці толькі на чацвёртым месцы. Спачатку ігра складвалася не ў карысць універсітэцкіх валейбалістак: нашы дзяўчаты праігрывалі з лікам 1:2, але яны ўсё ж змаглі мабілізавацца і перамаглі сваіх саперніц. Апярэдзіла валейбалістак універсітэта толькі каманда інстытута фізкультуры. На 3-м месцы — каманда політэхнічнага інстытута.

Востра праходзіла сустрэча нашай мужчынскай каманды з валейбалістамі політэхнічнага інстытута. Нягледзячы на тое, што ў камандзе політэхнікаў было пяць майстроў спорту, яны не змаглі супрацьстаяць энтузіязму і задору спартсменаў універсітэта. Аднак, прайграўшы камандзе ІФК, нашы валейбалісты аказаліся на ІІІ месцы. Першае занялі студэнты політэхнічнага інстытута, на другім— валейбалісты інстытута фізкультуры.

В. ЯКАНЕН,
ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

ВЯЗЫНКА. ЗЛЁТ ТУРЫСТАЎ

Выгляд выходзячага з электрычкі шумлівага натоўпу людзей з рукзакамі і гітарамі даўно ўжо перастаў здзіўляць жыхароў вёскі Вязынка. Але такі масавы «налёт» здарыўся упершыню — на ІХ злёт турыстаў БДУ прыбыло звыш 250 чалавек.

Усю гэтую шумлівую і вясёлую армію павялі на лясную паляну непадалёку ад Вязынкі. Праўда, спачатку шлях пралёг праз «Азбуку турыстаў» — наладжаную ў бліжэйшай лагчыне выстаўку карцінак (маляваных і жывых), паясняючых асобныя моманты турысцкага жыцця.

Пад'ём флага злёту назначаўся на наступны дзень, раніцай, але спаборніцтвы пачаліся, як толькі турысты паспелі размясціцца ў палатках.

Для мяне самым моцным уражаннем ад злёту быў удзел у начным арыентаванні. Можа, ноччу ў лесе і страшна крыху, але адчуванне, калі прадзіраешся праз ельнік і убачыш раптам касцёр на пікеце, параўноўваю толькі з адчуваннем матроса пры крыку «Зямля»!

Калі вярнуліся арыенціроўшчыкі, каля агульнага кастра пачаўся конкурс песні. Як вядома, сярод турыстаў пяюць усе (ужо хто як), і таму суддзям хапала работы. Першае месца было прысуджана камандзе ветэранаў турызму БДУ, якія прыехалі на злёт «трахнуць старыной».

А потым, пасля вячэры (вядома, таксама конкурснай) быў дадзен афіцыяльны адбой. «Афіцыяльны» — у сэнсе хто хоча, можа спаць, але большасць хацела спяваць. Спявалі натхнёныя ветэраны, спявалі стомленыя суддзі, спявалі ўсе, хто не наспяваўся на конкурсе і хто ў ім не ўдзельнічаў.

А раніцай на ўрачыстай лінейцы быў паднят флаг турклуба БДУ. І пачаліся спаборніцтвы на паласе перашкод. Палосы былі аформлены з пачуццём, толкам, расстаноўкай і дрэнна захаваным жаданнем баўтануць у ваду як мага большую колькасць удзельнікаў.

Але удзельнікі бадзёра бегалі, скакалі, поўзалі, падалі ў ваду і ўжо на фінішы на апошнім дыханні пыталі: «Ну, колькі секунд?».

Першае месца заваявала каманда чацвёртага курса матфака (камандзір — Мацвееў). Ей быў уручан на заключнай лінейцы першы прыз — торт.

І мне здаецца, засталіся задаволенымі ўсе: і удзельнікі, і суддзі, а маладыя, неабстрэляныя турысты, пабываўшы на злёце, сямутаму навучыліся.

В. ВАРАЧАЕВА.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР М. І. ІОСЬКА.

АТ 02460. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1872